**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ДЫЛА ЯЗЭП (ВОСІП ЛЯВОНЦЬЕВІЧ)

**ПРАЗАІК, ДРАМАТУРГ, ГРАМАДСКІ І ДЗЯРЖАЎНЫ ДЗЕЯЧ**

**2 (14) КРАСАВІКА 1880 Г. – 7 КРАСАВІКА 1973 Г.**

**ФОНД № 53**

**ВОПІС № 2**

**1900-1968, 1993 гг.**

**МІНСК 2021**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 2 ф. 53**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ Я. ДЫЛЫ | 1-13 | 1-2 |
| 2. | ПЕРАПІСКА Я. ДЫЛЫ | 14-26 | 2-3 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ Я. ДЫЛЫ | 14-18 | 2 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ Я. ДЫЛУ | 19-26 | 2-3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я. ДЫЛЫ І ІНШ. | 27-35 | 3-4 |

## Прадмова

**Дыла Язэп (Восіп Лявонцьевіч)** нарадзіўся 2 (14) красавіка 1880 г. у г. Слуцку Мінскай губерні ў сям'і паштовага служачага Лявонція Цярэнцьевіча Дылы і яго жонкі Марыі Фёдараўны. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі (1891–1900 гг.), Юр'еўскім (цяпер эстонскі Тарту) ветэрынарным інстытуце (1900–1902 гг.), адкуль быў выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях без права паступлення ў іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.[1] У пошуках працы Я. Дыла вярнуўся ў Беларусь і ўладкаваўся ў газету "Северо-Западный край". У 1905 г. узначальваў арганізацыйную групу Мінскага камітэта РСДРП. Працаваў у выдавецтвах Пецярбурга, Арэнбурга, Казані, Масквы (1906–1918 гг.). Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. уваходзіў у Маскоўскую арганізацыю Беларускай сацыялістычнай грамады. На 3-м з'ездзе БСГ (кастрычнік 1917) выбраны старшынёй. Дэлегат Усебеларускага з'езда (снежань 1917, Мінск). У 1918 г. падтрымліваў сувязі з Беларускім нацыянальным камісарыятам у Маскве, з лістапада 1918 г. член Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б), дэлегат канферэнцыі беларускай секцыі РКП(б). Удзельнічаў у падрыхтоўцы абвяшчэння БССР. Увайшоў у склад Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, дзе займаў пасаду камісара працы. Процістаяў палітыцы А. Мяснікова, за што ў лютым 1919 г. па рашэнні ЦБ КП(б)Б арыштаваны і высланы з Беларусі. Працаваў у Маскве ў Цэнтрасаюзе РСФСР, удзельнічаў у рабоце клуба "Беларус", разам з А. Бурбісам і Ф. Туруком падрыхтаваў дакладную запіску па гісторыі Беларусі ў Народны камісарыят замежных спраў РСФСР. З 1921 г. старшыня праўлення Цэнтрабелсаюза ў Мінску, у 1923–1924 гг. старшыня Дзяржплана БССР, з лістапада 1924 г. вучоны сакратар Інбелкульта, з 1926 г. дырэктар БДТ-1, дырэктар Інстытута па вывучэнні мастацтва Інбелкульта, намеснік загадчыка "Белдзяржкіно". У ліпені 1930 г. арыштаваны органамі АДПУ па абвінавачванні ў прыналежнасці да так званага "Саюза вызвалення Беларусі", які быццам бы існаваў на Беларусі. У красавіку 1931 г. калегіяй АДПУ БССР сасланы ў г. Кунгур Пермскай вобласці. Тут працаваў у друкарні Уралпаліграфтрэста (1930–1931 гг.); эканамістам на Яраслаўскім гумава-асбеставым камбінаце (1931–1932 гг.). З 1932 г. жыў у г. Саратаве. Працаваў вучоным бібліёграфам у Навукова-даследчым Інстытуце спажывецкай кааперацыі, загадчыкам часопісна-газетнага аддзела "Облсправки"; карэктарам абласнога выдавецтва "Коммунист". У жніўні 1938 г. зноў арыштаваны УНКУС Саратаўскай вобласці, у сакавіку 1939 г. справа супраць яго спынена. Рэабілітаваны ў лістападзе 1957 г. Вярхоўным судом БССР.

Памёр Язэп Дыла 7 красавіка 1973 г. у г. Саратаве.

Пачаў друкавацца з 1903 г. у газеце "Северо-Западный край", дзе змяшчаў допісы на грамадска-палітычныя тэмы. Як публіцыст і пісьменнік, тэатральны дзеяч друкаваўся ў "Нашай ніве" (абразок "Перад раніцаю..." і верш "Вечар ясны ціхі..." (1912) і інш. Выкарыстоўваў псеўданімы і

[1] Ф. 53 В. 2 Спр. 27 Асабістая справа студэнта Юр'еўскга ветэрынарнага інстытута Я. Дылы (1900–1904 гг.)

крыптанімы: Антон Небарака, Н. Бываеўскі, Наз. Бываеўскі, Назар Бываеўскі, Nazar Bywajeuski, А. Дыл, А. Дыла, Анна Дыла, Жорсткі, Л. Жорсткі, Тодар Кулеш, Т. Кулеша, Язэп; Н.Б., Наз. Б., Н. Б – і, Н. Б-скі, Наз. Б-скі, Я. Д., Язэп Д., Яз. Д-а. Аўтар апавяданняў "Усурыйскі драпежнік" і "Спужаўся… дурненькі!", гістарычнага рамана "На шляху з варагаў у грэкі" (не закончаны, урыўкі апубл. у 1981), аповесці "Настасся Мякота" (пазнейшая назва "У імя дзяцей", апубл. 1968), п'ес "Панскі гайдук" (паст. 1924, апубл. 1926), "Юнак з Крошына" (апубл. 1965), "Падуанскі студэнт" (апубл. 1981), публіцыстычных артыкулаў "Праз мукі – да шчасця камунізма" (1918), "Беларускае жыццё ў Маскве" і "Беларуская секцыя Расейскай камуністычнай партыі" (1918). Таксама выступаў і як мемуарыст: "Светлы вобраз" (1957, пра Я. Коласа), "Пісьменнік-дэмакрат Альгерд Абуховіч" (1958), "Сустрэча ў Пяцігорску" (1959, пра Цішку Гартнага), "Чалавек вялікага сэрца" (1960, пра Я. Купалу), "Сустрэча з Янам Райнісам" (1962). Даследаваў гісторыю беларускага тэатра, аўтар артыкулаў: "Менская трупа "Першага таварыства беларускай драмы і камедыі" [1920-я], "Тэатральная "задума" 1892 году ў Радашковічах" (1957), "Беларускія спектаклі ў перыяд рэвалюцыі 1905 году" (1957), "Першы прафесійны тэатар" (1967), "Беларускія драматычныя гурткі на Случчыне", "Раннія іскры таленту" і інш.

Дакументы Я. Дылы паступілі ў БДАМЛМ з Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны ў 2004 г., калі Цэнтр, згодна загаду Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.01.2004 г. №29, як самастойная юрыдычная асоба быў ліквідаваны і далучаны да Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя М. Танка.

У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі складзены вопіс №2 у колькасці 35 адзінак захоўвання (85 дакументаў) за 1900–1968, 1993 гг.

Вопіс складаецца з трох раздзелаў, справы ў якіх сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе.

Прадмову склала Г.Б. Багамолава
Вядучы архівіст
2021

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ Я. ДЫЛЫ** | | | | |
| 1 | "З балючага сэрца бацькі",<br>Назар Бываеўскі. "Перад раніцаю" (без пачатку). Абразкі.<br>Аўтограф | [1909-1912] | 2 | 2 | |
| 2 | Апавяданне пра Янку Турца. Варыянты.<br>Аўтограф | [1943] | 18 | 2 | |
| 3 | Назар Бываеўскі. "Рождённый ползать, летать не может...". Апавяданне. Варыянты.<br>Аўтограф | [1940-я-1950-я гг.] | 10 | 2 | |
| 4 | "Вось такая!" (без канца), "Лад з Богам" і "Ружа" (урыўкі). Апавяданні.<br>Аўтограф | [1950-я гг.] | 15 | 3 | |
| 5 | "Спозненае каханне". Апавяданне.<br>Сшытак. Аўтограф | [1950-я гг.] | 13 | 1 | |
| 6 | Тодар Кулеша. "Матэрыялы да біяграфіі Паўлюка Багрыма". Варыянты.<br>Аўтограф, чарнавы аўтограф | [1950-я гг.] | 30 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | Аўтабіяграфічныя ўспаміны.<br>Аўтограф, чарнавы аўтограф | [1950-я-1960-я гг.] | 25 | 3 | |
| 8 | [Успаміны] пра беларускі хор у Вільні 1910 г. Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф | [1950-я-1960-я гг.] | 6 | 1 | |
| 9 | "Наш байкапісец". Успаміны пра А. Абуховіча.<br>Аўтограф | [к. 1950-х-1960-я гг.] | 9 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 10 | "Белорусский театр 1917-1932 годов". Рэцэнзія на рукапіс У.І. Няфёда.<br>Машынапіс | 1962 | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 11 | Фрагмент руска-беларускага слоўніка (словы на літару "А").<br>Аўтограф | [1940-я гг.] | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | Разрозненыя старонкі з запісамі па гісторыі Беларусі і інш.<br>Аўтограф | [1940-я-1960-я гг.] | 17 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | Бібліяграфія па археалогіі, геаграфіі, гісторыі БССР, беларускім мастацтве і інш.<br>Сшытак. Аўтограф | [1950-я-1960-я гг.] | 14 | 1 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА Я. ДЫЛЫ** | | | | |
| | **2.1. ПІСЬМЫ Я. ДЫЛЫ** | | | | |
| 14 | Пісьмы П.У. Броўку, Я. Коласу, У.Ф. Луцэвіч | 1944-1946, 1964 | 13 | 4 | |
| 15 | Пісьмы А.С. Лісу, С.А. Пятровічу | 1959-1966 | 8 | 3 | |
| 16 | Пісьмо са зваротам "Леночка, Клёдя, Серёжа!" | 1966 | 3 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 17 | Пісьмо Д.С. Ангелаву (Балгарыя) | 1959 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | Пісьмо завучу Слуцкай школы № 1 Р.Г. Федароўскай з падзякай за запрашэнне на 350-годдзе ўстановы | 1967 | 2 | 1 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ Я. ДЫЛУ** | | | | |
| 19 | Пісьмы Ю.І. Бібілы, У.М. Дубоўкі, А.С. Ліса, С.А. Пятровіча, І.У. Саламевіча, М.М. Улашчыка | 1959-1968 | 15 | 13 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | Пісьмо Саратаўскага філіяла Інстытута тэхнічнага | 1954 | 3 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | навучання Я. Дылу аб падрыхтоўцы тэматычнага плана.<br>Прыкладзены тэматычны план "Работа отдела газетно-журнальных вырезок", складзены Я. Дылам. Лл.2-3 | | | | |
| 21 | Пісьмы БелСЭ, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна, рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва" і інш. Я. Дылу па пытаннях супрацоўніцтва і інш. | 1956-1968 | 5 | 5 | |
| 22 | Пісьмы Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР Я. Дылу аб напісанні аўтабіяграфіі, успамінаў і інш. | 1957-1964 | 14 | 6 | |
| 23 | Пісьмо Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР Я. Дылу аб звестках пра П. Багрыма.<br>Прыкладзена машынапісная копія паказанняў сведкі П. Багрыма. Л.2 | 1958 | 2 | 2 | |
| 24 | Пісьмо Вярхоўнага Савета БССР Я. Дылу аб аказанні грашовай падтрымкі-дапамогі | 1966 | 1 | 1 | |
| 25 | Пісьмо завуча Слуцкай СШ №1 Р.Г. Федароўскай Я. Дылу.<br>Прыкладзена запрашэнне Слуцкага РК КПБ і гарвыканкама на ўрачысты вечар, прысвечаны 350-годдзю СШ №1 на імя Я. Дылы. Л. 2 | 1967 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Перапіска Беларускага аддзялення Літфонда СССР з Я. Дылам аб аднаўленні членства ў гэтым фондзе | 1959-1961 | 3 | 3 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я. ДЫЛЫ І ІНШ.** | | | | |
| 27 | Асабістая справа студэнта Юр'еўскага ветэрынарнага інстытута Я. Дылы (1900-1904 гг.). Ксеракопіі 2021 г.<br>Месца захоўвання: Эстонскі гістарычны архіў г. Тарту (Ф. 404, спр. 651) | | 34 | 1 | |
| 28 | Паведамленне аб'яднання беларускіх пісьменнікаў "Полымя" Я. Дылу аб правядзенні сходу і просьбай з'явіцца на яго | [1927-1930] | 1 | 1 | |
| 29 | Даведка Народнага камісарыята асветы БССР Я. Дылу аб накіраванні яго на лячэнне ў г. Кіславодск | 1930 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 30 | Заявы Я. Дылы ў Народны камісарыят асветы БССР і дырэкцыю беларускай дзяржаўнай бібліятэкі з просьбай уладкавацца на працу.<br>На адваротным баку - аператыўная зводка з фронту ад Савецкага інформбюро за 8 жніўня 1944 г. | 1944 | 2 | 2 | |
| 31 | Звесткі аб заахвочваннях і ўзнагародах [Я. Дылы] за 1948-1953 гг. | | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 32 | [П. Гуткоўскі. Вокладка да п'есы Назара Бываеўскага "Панскі гайдук" (1926)].<br>Фотарэпрадукцыя | | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 33 | П. Багрым. "Зайграй, зайграй, хлопча малы...". Верш.<br>Машынапіс | [1950-я гг.] | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | Фатаграфіі дзеючых асоб спектакля "Пяюць жаваранкі" па п'есе К. Крапівы, пастаўленага рэж. К.М. Саннікавым у тэатры імя Я. Купалы, з удзелам В.У. Галіны, Г.Ю. Грыгоніса, У.І. Дзядзюшкі, Л.С. Драздовай, П.І. Іванова, Б.В. Платонава, Л.І. Ржэцкай і інш.<br>Рэпрадукцыі | [п.п. 1950-х гг.] | 9 | 9 | |
| | * * * | | | | |
| 35 | Спіс дакументаў Я. Дылы, перададзеных у ННАЦ імя Ф. Скарыны, складзены ст.н. супрацоўнікам Цэнтра М.М. Яніцкай | 1993 | 7 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 35 (трыццаць пяць)

спраў з № 1 па № 35 , 85 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.